УДК 882.6.09(091)(075.8)

**Ж. В. Косціна**
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы

# ЭСТЭТЫЧНЫ ІДЭАЛ ПАЭЗІІ ЯНА ЧАЧОТА

У артыкуле аналізуюцца вершы і балада «Мышанка» Яна Чачота, а таксама яго публіцыстычныя выступленні з мэтай выяўлення эстэтычнага ідэалу паэзіі. Расшыфроўка паняцця «эстэтычны ідэал» з пазіцый эстэтыкі і літаратуразнаўства дазваляе вызначыць шляхі вырашэння пастаўленай мэты. Раскрываюцца асаблівасці фарміравання асобы Яна Чачота ў час яго філаматцкага перыяду, сутнасць яго фальклarыстычнай дзейнасці дзеля высвятлення яго ідэйных перакананняў, якія пасля па-мастацку ўзнаўляюцца ў тэкстах. Аўтар артыкула акцэнтуе ўвагу на такіх хрысціянскіх каштоўнасцях, як цнота, любоў, працавітасць, бо менавіта яны ўтвараюць разуменне прыгожага жыцця, якое ўвасобіў у сваёй паэзіі Ян Чачот.

**Ключавыя словы:** эстэтычны ідэал, новая беларуская літаратура XIX стагоддзя, паэзія Яна Чачота, балада, хрысціянскія каштоўнасці, сімвал голуба.

**Уводзіны.** Эстэтычны ідэал выступае асноўнай катэгорыяй мастацкай літаратуры. Пытанне эстэтычнага ідэалу даўно прыцягвае да сябе ўвагу даследчыкаў як у тэарэтычным, так і ў метадалагічным плане (Г. М. Паспелаў, Ю. Б. Бораў, В. Я. Халізеў). У апошнім выпадку неабходна падкрэсліць, што ён уяўляе сабой вызначаны прынцып даследавання мастацкіх твораў, які скіраваны на пазнанне індывідуальна-непаўторнага і гістарычна-тыпалагічнага ў творчым вопыце пісьменніка. Яго сфера — літаратурныя феномены, якія з'явіліся дзякуючы намаганням творчай асобы. Першая палова XIX стагоддзя можа быць названа перыядам «станаўлення беларускай мастацкай традыцыі» (А. С. Яскевіч), што абумовіла далейшае фарміраванне ідэйнага зместу нацыянальнай літаратуры ажно да першай трэці XX стагоддзя (канцэпцыя адзінай плыні, сфармуляваная І. Э. Багдановіч). Неабходнасць разгляду эстэтычнага ідэалу паэзіі Яна Чачота тлумачыцца тым, што духоўныя каштоўнасці, якія выступаюць побач з гармоніяй — асноўнай катэгорыяй эстэтычнага ідэалу, — могуць па-рознаму тлумачыцца ў залежнасці ад магістральных рухаў і тэндэнцый развіцця грамадства, пад знакам якіх праходзіць тая або іншая эпоха. Беларускае літаратуразнаўства (А. А. Лойка, М. А. Лазарук, А. А. Семяновіч, У. І. Мархель) доўгі час не разглядала ў якасці асновы эстэтычнага ідэалу масіў хрысціянскай культуры, што была дамінуючай у жыццеўпарадкаванні нашых продкаў. Спроба гэта зрабіць на аснове аналізу паэзіі Яна Чачота рэалізуецца аўтарам артыкула.

**Матэрыялы і метады даследавання.** Матэрыялам даследавання служаць вершы і балады Яна Чачота, а таксама яго публіцыстычная і эпісталярная проза. Даследаванне грунтуецца на інтэгратыўным падыходзе да аналізу літаратурных з'яў, у межах якога выкарыстаны элементы філалагічнага аналізу мастацкага тэксту, герменеўтыкі, біяграфічнага і гісторыка-культурнага метадаў.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Акрэсліць эстэтычны ідэал паэзіі нашага слыннага земляка Яна Чачота неабходна ўжо па той прычыне, што менавіта з яго творчай дзейнасці распачынаецца станаўленне нацыянальнай традыцыі. На думку беларускага гісторыка, літаратуразнаўца, пісьменніка і археографа Г. В. Кісялёва, «перыяд станаўлення новай беларускай літаратуры займае надзвычай важнае месца ў гісторыі народа» [1, с. 383]. Адносна нядаўна вызначылася роля Я. Чачота ў станаўленні беларускай нацыянальнай традыцыі. Айчынны літаратуразнавец А. С. Яскевіч у 80-х гадах XX стагоддзя



Рэпазіторый БарДУ

ў кнізе «Становление белорусской художественной традиции» адзначаў: «Несправядлівай доўгі час была наша крытыка ў ацэнцы як светапоглядных арыентацый, так і светаразумення ў цэлым, паэтаў філаматцкага крыла, ацэнцы, якая знаходзілася ў антаганізме з сапраўднымі фактамі іх высокаграмадзянскай дзейнасці» [2, с. 30].

Характарыстыку асобе Яна Чачота даў У. І. Мархель: «Ян Чачот — паэт-фалькларыст, творчасць якога лучылася з беларускім фальклорам на ўзроўні яго назапашванняасэнсавання і мастацкага асваення. Гэтыя дзве іпастасі не толькі прымірыліся ў ім, але і выпрацоўвалі двухадзінства падзвіжніцкай фалькларыстычнай дзейнасці і паэтычнай практыкі. Будучы паводле прызвання паэтам, а паводле творчых інтарэсаў — фалькларыстам, Ян Чачот змог вызначыць параметры прымянення сваіх здольнасцей на ўсё жыццё» [3, с. 177—178]. Менавіта праз разгляд у адзінстве паэтычнай творчасці і фалькларыстычнай дзейнасці аўтара можна вызначыць дамінуючы вектар эстэтычнага ідэалу паэзіі Яна Чачота. Эстэтычны ідэал — адна з самых складаных катэгорый эстэтыкі. Такі ідэал фарміруецца шляхам адбору лепшых эстэтычных арыентацый; гэта тое, што бачыць чалавек у сваім уяўленні, вобраз жаданага, і ён служыць крытэрыем ацэнкі ўжо існуючага [4, с. 45]. Літаратуразнаўчае тлумачэнне паняцця дакладна акрэсліў В. П. Рагойша: «Ідэал эстэтычны — выяўлены ў канкрэтна-пачуццёвай форме ўзор эстэтычнай дасканаласці чалавека і чалавечага жыцця. Цесна звязаны з іншымі грамадскімі ідэаламі (эстэтычным, сацыяльным, палітычным і інш.), але, у адрозненне ад іх, не можа існаваць як абстрактнае паняцце. Сфера яго бытавання — творы мастацтва, у першую чаргу — мастацкай літаратуры. У той час як форма ўвасаблення ідэалу эстэтычнага — розныя віды мастацтва, характар яго, аднак, прадвызначаецца самім жыццём, жаданнем абнавіць, палепшыць яго згодна ўяўленню чалавека аб прыгожым жыцці. У кожнага сваё разуменне прыгожага жыцця, ды паколькі людзі жывуць у пэўную эпоху, належаць да пэўных дзяржаўных, нацыянальных, сацыяльных супольнасцей, ідэал эстэтычны мае часавы, нацыянальны, сацыяльна-класавы характар» [5, с. 133]. Зыходзячы з дадзенага тлумачэння, узор дасканалага чалавека і дасканалага жыцця Чачот бачыў у хрысціянскай рэлігіі, асноўныя катэгорыі якой па-мастацку ўвасабляў у паэзіі і яшчэ філаматам яе значэнне тлумачыў у тэзісах выступлення на тэму «Думкі для ніжэйшага класа»: «Рэлігія не толькі аб’ядноўвае людзей з творцам, яна не толькі ўцеха і вышэйшая асалода для сэрцаў, знясіленых пад цяжарам няшчасцяў і чалавечых заган, але і шчыт супраць варожых грамадству яго членаў, яна — краевугольны камень, на які абапіраецца мараль і тленнае шчасце» [6, с. 199].

Аналізуючы філасофскія погляды членаў тайных студэнцкіх арганізацый Віленскага ўніверсітэта, аўтар «Философской мысли Беларуси» А. А. Козел лічыць: «Маральны стан грамадства яны [філаматы] напрамую звязвалі з формай дзяржаўнага кіравання: ў дзяржаве з дрэнным кіраваннем не можа быць добрых грамадзян. У фарміраванні дабрачыннасцей з’яўляецца вялікай роля рэлігіі і права. Імкненне разглядаць усе пытанні грамадскага і дзяржаўнага жыцця скрозь прызму маралі — характэрная рыса светапогляду філаматаў» [7, с. 249]. Даючы парады вышэйшаму класу, Ян Чачот вызначае пазіцыю прадстаўніка рэлігіі — «духоўніка», што «ён жыве на зямлі, што са светам сувязі не парваў, корміцца хлебам, які дае зямля і праца суайчыннікаў, і што задача яго — не замахвацца на асвету і філасофію, не ведаючы, што яны такое, а пашыраць святло навук, каб не сляпых, а адукаваных схіляць хутчэй да чыстай маралі і рэлігіі» [6, с. 202].

У. І. Мархель, які дасканала даследаваў паэтыку і ідэйна-сэнсавы бок твораў, сцвярджаў: «Ян Чачот быў не гаспадаром, а мастаком жыцця. Імкнучыся яго ўпрыгожыць, а то і палепшыць, ён самаахвярна займаўся той творчасцю, якая, на яго думку, павінна служыць грамадству і ўдасканаленню асобы. Будучы натурай цэльнай і мэтанакіраванай,

Репозиторий БарГУ

Чачот да канца дзён не адступіўся ад ідэалаў маладосці» [3, с. 180]. Яшчэ ў віленскі перыяд малады паэт выкарыстоўвае рэлігійную мелодыю і піша песню «Сон свой скінуў пан вясёлы», у якой захапляецца прыгажосцю прыроды, адкрытасцю душы, духоўнай працавітасцю тых, хто служыў ідэалам прамяністасці: «Сон свой скінуў пан вясёлы — // Красавік ідзе праз сёлы // Абуджаць лясы і долы. // Алілуя, алілуя, алілуя. // Не, з іх кожны — працавіты, // Да людзей душой адкрыты, // Годны продкаў, самавіты. // Алілуя, алілуя, алілуя» [6, с. 41]. Верш-імправізацыя ўзрушыў слухачоў, і яны, паводле слоў Ігната Дамейкі, «пасля апошняй страфы падхапілі Яна на рукі і амаль не задушылі ад любові» [6, с. 319].

Абуджэнне прыроды, цнота, пяшчота красавіка выклікаюць паэтычнае натхненне, стымул якога зарадзіўся ў хвіліну з'яўлення першага чалавека. Гэта разгадаў «бацька рускіх паэтаў» Гаўрыіл Дзяржавін: «Лирическая поэзия показывается от самых пелен мира. Она есть самая древняя у всех народов; это отлив разгорячённого духа; отголосок расторгнутых чувств; упоение или излияние восторженного сердца. Человек из праха возникший и восхищённый чудесами мироздания, первый голос радости своей, удивления и благодарности должен был произнести лирическим восклицанием. Всё его окружающее: солнце, луна, звезды, моря, горы, леса и реки напояли живым чувством и исторгали его гласы» [8, с. 196].

Турэмнае зняволенне, прымусовы ад'езд у далёкую Сібір выклікалі зусім процілеглы настрой Чачотавай ліры у вершах «Яна далёка», «Толькі Айчына і Зося», «Вандроўная пташка», але канцэпцыя чалавечых узаемаадносін засталася вернай хрысціянскай традыцыі — трыванне, чаканне, адданасць чыстаму каханню і сяброўству. У гады ссылкі ў тэкстах вершаў «Голуб», «Да голуба» ўзнікае вобраз голуба, які сустракаецца ў народнай паэзіі і лічыцца сімвалам мяккасці і кахання («...Голуб сівы, голуб сівы, галубка сівейша...», «Не гуляй, галубка, твой галубочак», «Ой, ішоў я міма твой двор, тай дзяўчынанька мая, / Ой зачуў я твой галасок, тай галубанька мая...»). Даследчыца творчасці Яна Чачота Т. Кохан адзначае: «Спецыфіка фальклору як узору калектыўнай творчасці абумовіла адсутнасць адназначнага тлумачэння многіх птушыных вобразаў, аднак для Я. Чачота, чалавека веруючага, з акрэсленым светапоглядам і жыццёвымі ўстаноўкамі, такая амбівалентнасць не характэрная. Пры стварэнні сімвала паэт у асноўным абірае адметную рысу птушкі, а пасля "тыражыруе" вобраз-клішэ ў творах. Паэтычнымі штампамі выступаюць наступныя арнітонімы: салавей — "найлепшы спявак", голуб — "пасланнік, вястун", сарока — "балбатуха"» [9, с. 153].

У тэкстах Біблії голуб — сімвал добрай весткі, ён прыносіць Ною галінку алівы, што апавясціла пра заканчэнне патопу; голуб з'яўляецца над галавой Ісуса пры хрышчэнні ў рацэ і ўвасабляе Святы Дух; белых галубоў выпускаюць з рук веруючыя на свята Благавешчання; у адной з песень Псалтыры гаворыцца пра крылы, якія здольны вызваліць ад пакут: «І я сказаў: хто даў бы мне крылы, як у голуба? я паляцеў бы і супакоіўся б» [Пс. 54:7]. У паэзіі Яна Чачота голуб — сімвал добрай весткі, вольнага духу: «Голуб мой белы, госць мой вясняны, // Скуль ты сюды завітаў? // Ці пад зарой, дзе ручай ля паляны, // Мілай маёй не страчаў? // Ах, паляцеў ты туды ўжо, дзе ў змроку // Любы мой друг пад замком. // Ты і яго хоць суцеш там звысоку, // Веру вярні як тайком. // Голуб мой белы, госць мой вясняны, // З Богам! Бывай, дарагі! // Ах, калі час той настане жаданы? // Здымем калі ланцугі?» [6, с. 51].

Ужо пасля вяртання з выгнання Ян Чачот актыўна разгорне сваю асветніцкую дзейнасць — прадоўжыць збіраць песні беларускага люду, пачне аналізаваць, перакладаць і папулярызаваць народную творчасць, вывучаць крывіцкі дыялект. Такая самаахвярная праца была выклікана не толькі жаданнем папулярызаваць «гмінную» паэзію сярод тых, «хто нічога добрага не хоча бачыць ва ўсім, што ёсць простанароднае, сялянскае» [6, с. 212], але і неабходнасцю навуковага

Рэпазіторый БарДУ

абгрунтавання даследаванняў беларускага фальклору. Апошняя матывацыя была вызначана яшчэ ў часы навучання ў Віленскім універсітэце, дзе любімы філаматамі выкладчык Іяхім Лялевель, прафесар, адзін з першых тэарэтыкаў гістарычных навуковых даследаванняў, чытаў лекцыі і знаёміў студэнтаў з працамі Зарыяна Даленгі-Хадакоўскага — навукоўца пачатку XIX стагоддзя, які «па праву лічыцца піянерам славяназнаўства» [9, с. 6]. Разважаючы ў артыкуле «Славяншчына да хрысціянства» пра пачатак славянскай гісторыі, ён сцвярджае: «Оно (начало славянской истории) рассеяно на целом пространстве земли славянской, под кровлей сельской, в неизвестности и скромно проводит веки или на полях, лугах и в дубравах наших утешает своих любимцев и давно ожидает другого Макферсона» [10, с. 73]. Малады паэт падрыхтаваў да аднаго з пасяджэнняў філаматаў спецыяльны рэферат, які прысвяціў названаму артыкулу, чым падштурхнуў Тамаша Зана, Адама Міцкевіча ствараць свае балады.

А. Баршчэўскі, прафесар Варшаўскага ўніверсітэта, прэзідэнт польскай асацыяцыі беларусістаў, перакананы: «Задумваючыся над роляй чалавечага і пейзажнага ўплыву на асобу будучага пісьменніка і фальклатыста, усё ж мы павінны беларускую духоўнасць, а не беларускую прыроду паставіці на першым месцы» [11, с. 32]. Ва ўласных сялянскіх песнях, напісаных добрай беларускай мовай і змешчаных у чацвёртым зборніку фальклорных матэрыялаў «Сялянскія песні з-над Нёмна і Дзвіны з далучэннем іх арыгіналаў на славянска-крэвіцкай мове», лірычны герой выступае ў ролі прапаведніка, які выконвае настаўніцкую місію, калі ў дыдактычнай форме вучыць сялян не піць гарэлку («Як то добра, калі мужык // Трэзвы, гаспадарны», «Напіліся братцы трохі // Пайдзём да хаты, да сохі // Мужык пры сасе, то краса! // Карчма зробіць свінапаса», «Каб у карчме не сядзеў, // То бы чысценькі хлеб еў; // А то зрабіла карчма, // Што куска хлеба няма», «Маладыя маладзіцы, // Ой, не піце гараліцы; // Нішто гідчэй колам света, // Як піяная кабета»), калі паракае балбатлівых кабет, сароміць сялян за бруд і неахайнасць у хаце і гаспадарцы . Некаторыя ўласныя сялянскія песні маюць прытчавы характар («Плакала бяроза ды гаварыла», «Калі ў зямлю зерне кінеш»), што таксама выклікае алюзіі са спецыфікай тлумачэння ісціны ў Бібліі.

Даследуючы творчасць Яна Чачота, І. Ф. Штэйнер сцвярджаў: «Гэтыя песні вызначаюцца сваёй наіўнасцю, прастатой і прыгажосцю, а таму, акрамя сваёй прывабнасці, могуць выказаць і нешто значна большае: характар, звычаі і норавы краю, дзе яны спяваюцца» [12, с. 87]. У вершы «Поле, поле шырокае» голас самога паэта, праслаўляючы сонечнае ззянне, яснасць неба, зліваецца з народнам хорам і просіць бласлаўлення працы на зямлі: «Благаславі твае дзеткі, // Працу нашу і палеткі, // Благаславі ўсе людзі, // Няхай усім добра будзе!» [6, с. 194]. У гэтых радках закладзены сэнс жыцця селяніна, які складаецца з працы на зямлі пад боскаю аховаю.

У кнізе «Природа в свете Библии» А. С. Яскевіч тлумачыць, што менавіта селянін паводле сваіх заняткаў знаходзіцца ў кругазвароце прыродных стыхій, ён у прамым сэнсе дзіця прыроды, якая ўспрымаецца ім як «Дом для Жыцця і Храм для духу» [13, с. 147]. Ян Чачот імкнецца перадаць хрысціянскую сістэму поглядаў, што складалі аснову ідэалогіі беларускага земляроба.

Яшчэ ў філамацкі перыяд творчасці Ян Чачот звяртаецца да жанру балады. Даследчыкі яго творчасці па-рознаму ацэньваюць ступень прафесіяналізму паэта: адны абвінавачвалі аўтара ў імкненні быць дакладным у выкарыстанні фальклору, другія — у залішне дыдактычна-маралізатарскім змесце. Аналізуючы жанр балады ў творчасці Яна Чачота, У. І. Мархель піша: «Схільнасць Чачота да маралізавання нават у не вельмі прыдатным для гэтага жанры зыходзіла ад унутранай патрэбы паэта ўплываць на ўдасканаленне грамадства, але і было абумоўлена асветніцкай зададзенасцю мастацтва» [3, с. 185]. На думку Чачота, літаратура якраз і павінна выхоўваць чытача, закладваць арыенціры паводзін чалавека

Репозиторий БарГУ

незалежна ад яго сацыяльнага стану, нацыянальнасці, роду заняткаў. Чачотавы балады «Падземны звон на горцы ў Пазяневічах», «Узногі», «Свіцязь», «Мышанка» — гэта мастацкая інтэрпрэтацыя хрысціянскіх запаведзяў на аснове паданняў пра ўзнікненне назвы пэўнага локусу ці пра фантастычныя выпадкі ў жыцці сялян або шляхты. Самай пранікнёнай, узвышанай і паэтычнай з'яўляецца балада «Мышанка». У ёй апавядаецца пра з'яўленне назваў мястэчка Мыш і ракі Мышанка. Гэтыя легенды паэт пачуў у дзяцінстве, калі жыў з бацькамі ў фальварку недалёка ад маёнтку Рэпіхава Навамышскай парафіі Навагрудскага павета. Адно з паданняў — пра красуню-дачку, яе бацька Мышка, ліцвін, бядняк, «але быў ён гасціннасцю знаны» [6, с. 126]. Аднойчы дзяўчыну ўбачыў рыцар тутэйшага князя і ашалеў ад чароўнага выгляду прастачкі-ліцвінкі: «Падумаў сабе ён: напэўна, прастачка, // Ён лёгка яе ашукае. // Памкнуўся абняць, ды яна — ну і дзівачка! — // Наўцёкі, ратунку гукае» [6, с. 127]. Дзяўчына кінулася ў вір ракі, але не стала ахвярай юрлівасці спешчанага багача. Дзявоцкасць, цнатлівасць, чысціню ўславілі нашы продкі ў паданні пра з'яўленне назвы ракі Мышанка, бо менавіта гэтыя каштоўнасці ахоўваюць сялянства і нацыю ад генетычнага вырадджэння. Такое катэгарычнае сцвярджэнне дазваляюць зрабіць высновы некаторых прыхільнікаў тэорыі тэлегоніі (доктар біялагічных навук, доктар медыцынскіх навук Г. Д. Бердышаў, кандыдат біялагічных навук акадэмік А. Р. Блізнючэнка) [14]. Доктар медыцынскіх навук прафесар Уладзімір Барабаш у адным са сваіх інтэрв'ю адзначыў: «Звычай нашых продкаў захоўваць нявіннасць нявесты да замужжа зусім не быў сярэднявечнай забабоннасцю, з навуковага пункту гледжання гэта закон генетыкі. У паўсядзённым жыцці ён правераны і замацаваны цвёрдым, непарушным патрабаваннем праваслаўнай царквы "Не блудзі"» [15, с. 7]. Таму, рэпрэзентуючы адукаванаму чытачу вершаваныя хрысціянскія вераванні ліцвінскіх сялян, Ян Чачот эстэтызуе народны погляд на свет.

Аналізуючы спецыфіку эксперыментаў Чачота ў жанры балады, Лія Кісялёва піша: «Яшчэ адна разнавіднасць металепсісаў у баладах Я. Чачота — лірычныя адступленні (пад металепсісам французскі даследчык Ж. Жэнет разумее разнастайныя формы ўмяшання наратара ці адрасата ў падзеі, пра якія апавядаецца). Сучасны чытач прызвычаены да лірычных "адхіленняў ад тэмы" і ўспрымае іх як штосьці "арганічнае", як натуральную літаратурную ўмоўнасць» [16, с. 144]. У лірычным адступленні, якое завяршае твор, паэт спявае гімн малой радзіме: «О мілы ўспамін! Дарагая Мышанка! // Зноў снішся ты ў барве заранак. // Найпершая ў свеце мая ты каханка, // Мільгнуў тут жыцця майго ранак. // У чыстым крышталі тваім тут, здзіўлёны, // Я бачыў тады пад вадою // Чародку алешын, бор, узгорак зялёны // Сябе — і ўніз галавою» [6, с. 130]. Лія Кісялёва выказвае гіпотэзу такой нечаканай канцоўкі: «Ды, у рэшце рэшт, ніводнае з двух паданняў тут не гэтак і важнае. Тут важна, што аўтар сеў пісаць дыхтоўную баладу, абраў дзеля гэтага прыдатны, эфектны матэрыял, ды ў пэўны момант плынь тэксту падхапіла паэта, свавольна панесла яго на тыя берагі, дзе ён, бадай, і не чакаў апынуцца» [16, с. 145].

Берагі Мышанкі, дзе правёў сваё дзяцінства Ян Чачот, уяўляюцца паэту сапраўдным раем. На першы погляд, гэты сціплы пейзаж далёкі ад апісанняў эдэмаўскага саду, які пашанцавала ўбачыць юродзіваму святому Андрэю, што жыў у сярэдзіне V стагоддзя ў Канстанцінопалі, «з бясконцым мноствам птушак, адны з іх мелі крылы залатыя, другія, як снег, белыя, іншыя пярэсцяцца рознымі колерамі» [17, с. 160]. Але, калі ўлічыць тэорыю памяці асобы, што распрацавалі на пачатку XX стагоддзя рускі рэлігійны філосаф Л. П. Карсавін і паралельна з ім швейцарскі псіхіятр К. Г. Юнг, то моманты шчасця, якія находзяць на чалавека пры ўспамінах маленства, — гэта няўмысная згадка, праяўленне архетыпу раю, дзе прайшло дзяцінства чалавецтва.

**Заключэнне.** Станаўленне мастацкай традыцыі новай беларускай літаратуры мае



Рэпазіторый БарДУ

для айчыннага прыгожага пісьменства найважнейшае значэнне. Менавіта ў пачатку XIX стагоддзя, у «змрочны», «маўклівы» (Г. В. Кісялёў) перыяд, дзякуючы пачынальніку Яну Чачоту нараджаліся аксіялагічныя арыенціры эстэтычнага ідэалу беларускай літаратуры. Ян Чачот, рана рэпрэзентаваўшы сябе як дасканалы майстар пісаць на мове «гміннай», інтуітыўна адчуў «антэевую» апору айчыннай літаратуры. Крыніцай прыгожага для пачынальніка новай беларускай літаратуры была вусная народная творчасць, бо яна, на думку паэта, у найбольшай меры захоўвала хрысціянскае разуменне сутнасці прыроды, сацыяльных паводзін асобы. Хрысціянскія каштоўнасці, — любоў, працалюбства, цнота, якія складаюць узор дасканалых сацыяльных узаемаадносін — становяцца прыярытэтнымі ў ідэйным змесце паэзіі Яна Чачота.

### Спіс цытаваных крыніц


1. *Кісялёў, Г. В.* Ад Чачота да Багушэвіча : Праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры XIX ст. / Г. В. Кісялёў. — Мн. : Навука і тэхніка, 1993. — 397 с.
2. *Яскевич, А. С.* Становление белорусской художественной традиции / А. С. Яскевич. — Минск : Наука и техника, 1987. — 232 с.
3. Гісторыя беларускай літаратуры XI—XIX стагоддзяў : у 2 т. / навук. рэд. У. І. Мархель, В. А. Чамярыцкі. — Мн. : Бел. навука, 2007. — Т. 2. : Новая літаратура : другая палова XVIII—XIX стагоддзе. — 582 с.
4. *Каржаницкая, Т. В.* Эстетика / Т. В. Каржаницкая. — Минск : Равноденствие, 2004. — 351 с.
5. *Рагойша, В. П.* Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : дапам. В. П. Рагойша. — Мн. : БелЭн, 2001. — 384 с.
6. *Чачот, Я.* Выбраныя творы / Я. Чачот ; уклад. К. Цвірка — Мн. : Беларус. кнігазбор, 1996. — 374 с.
7. *Козел, А. А.* Философская мысль Беларуси / А. А. Козел. — Минск : Амалфея, 2004. — 352 с.
8. *Державин, Г. Р.* Стихотворения / Г. Р. Державин. — Л. : Худож. лит., Ленинград. отд-ние, 1981. — 288 с.
9. *Кохан, Т.* Фальклорная аснова вобразаў птушак у паэзіі Яна Чачота / Т. Кохан // Фальклор і сучасная культура : [у ? ч.] / рэдкал.: І. С. Роўда [і інш.] — Мн. : Выд. цэнтр БДУ, 2011. — Ч. 1. — С. 153—154.
10. *Даленга-Хадакоўскі, З.* Выбранае / З. Даленга-Хадакоўскі. — Мн. : Кнігазбор, 2007. — 448 с.
11. *Баршчэўскі, А.* Ян Чачот як чалавек і даследчык : [у ? кн.] / А. Баршчэўскі // Беларусіка. — Мн. : ННАЦ, 1998. — Кн. 10. Ян Чачот, Ігнат Дамейка — сябры і паплечнікі Адама Міцкевіча. — С. 30—138.
12. *Штэйнер, І. Ф.* Польскамоўная літаратура Беларусі / І. Ф. Штэйнер. — Гомель : ГДУ, 2004. — 183 с.
13. *Яскевич, А. С.* Природа в свете Библии / А. С. Яскевич. — Минск : Царкоўнае слова, 2003. — 167 с.
14. Телегония (теория) [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http: // ru.wikipedia.org/wiki/ — Дата доступа: 11.04.2014. — Загл. с экрана.
15. *Анатолий (иеромон.).* От блуда к… блуду / иеромонах Анатолий (Берестов) // Врата небесные. — 2008. — № 1. — С. 6—7.
16. *Кісялёва, Л. Г.* Балады Яна Чачота: разбурэнне канону / Л. Г. Кісялёва // Acta Albaruthenica. — № 10. — 2010. — Ss. 440.
17. *Богословский, М. М.* Душа человеческая = Anima hominis / М. М. Богословский, И. В. Князькин. — М. : Сова, 2006. — 319 с.


Матэрыял паступіў у рэдакцыю 16.04.2014 г.

In the article the poems and the ballad “Mishanka” by Yan Chechot as well as his journalistic performances for the purpoce of the aesthetic ideal demonstration are analyzed. The study of the term “the aesthetic ideal” makes it possible to single out the ways of the task realization. The peculiarities of Y. Chechot’s personality are revealed in the folklore facet. The article focuses on the Christian values which create the understanding and the concept of the beautiful life impersonated in Y. Chechot’s poetry.

**Key words:** the aesthetic ideal, the XIX century new Belarusian literature, Yan Chechot’s poetry, the ballad, Christian values, the symbol of the dove.

Репозиторий БарГУ